Принимая во внимание все вышеизложенное, можно сделать вывод, что данные статистики иезуитов все же не полностью отражают объективную реальность конфессиональной ситуации в Инфлянтах, однако могут использоваться для отражения динамики процесса распространения католичества на данной территории.

Подводя итоги представленному анализу Архива Динабургских иезуитов, следует отметить, что он содержит обширный пласт информации по истории Инфлянт XVII–XVIII вв. Поэтому изученные материалы имеют большой потенциал для научного анализа и представляют собой важнейший источник при характеристике исторических процессов на територии Инфлянт.


1. Bogdanoviča, T. Inflantijas rekatolizācijas procesa reprezentācija jezuītu mājas arhīva dokumentos / T. Bogdanoviča // Vēsture: avoti un cilvēki. XXVI Starptautiskie zinātniskie lasījumi. – 2017. – Lpp. 29–36.
2. Dunsdorfs, E. Latvijas vēsture 1600–1710 / E. Dunsdorfs. – Stokholma : Appelbergs Boktryckeri AB Uppsala, 1962. – 588 lpp.
3. Kleijntjenss, J. Latvijas vēstures avoti: Latvijas vēstures avoti jezuītu ordeņa archīvos / J. Kleijntjenss (sast.). – Rīga : Apgāds Latvju Grāmata, 1940. – Lpp. 242–459.
4. Kleijntjenss, J. Latvijas vēstures avoti: Latvijas vēstures avoti jezuītu ordeņa archīvos / J. Kleijntjenss (sast.). – Rīga : Apgāds Latvju Grāmata, 1941. – Lpp. 349–381.
5. Ogle, K. Societas Jesu ieguldījums Latvijas arhitektūras un tēlotājas mākslas mantojumā / K. Ogle. – Rīga : Latvijas Mākslas akadēmija, 2007. – 270 lpp.
6. Strods, H. Latvijas katoļu baznīcas vēsture 1075–1995 / H. Strods. – Rīga : Poligrāfists, 1996. – 123–185 lpp.
7. Гризингер, Т. Иезуиты. Полная история их явных и тайных деяний от основания ордена до настоящего времени / Т. Гризингер. – СПб.: ЛАНЬ, 1992. – 575 с.


**Булаты П.Ю.**

## КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ЛЯХАВІЦКАЙ КАТАЛІЦКАЙ ПАРАФІІ СВЯТОГА КРЫЖА XVII–XVIII стст.

Рыма-каталіцкая традыцыя з’яўлялася істотным фактарам у развіцці гісторыі і фармаванні культуры беларускіх зямель. Даследаванне гісторыі Касцёла неабходна для асвятлення шмат якіх з’яў, якія ўплывалі на развіццё грамадства ў розныя часы і стваралі вобраз тагачаснай дзяржавы. Пэўнай увагі заслугоўваюць найменшыя адзінкі Каталіцкага Касцёлу – парафіі, жыццё і дзейнасць якіх па-рознаму знайшлі адлюстраванне ў разнастайных карпусах гістарычных крыніц.

Каталіцкі касцёл існаваў у Ляхавічах з 1535 г., калі ў горадзе Альбрэхтам Гаштольдам была заснаваная парафія Святога Войцеха [17]. Пасля таго, як Ляхавіцкі маёнтак у 1572 г. перайшоў да роду Хадкевічаў, гетман вялікі літоўскі Ян Караль Хадкевіч у 1602 г. заклаў у Ляхавічах новы касцёл з тытулам Святога Крыжа. Жыццё парафіі і яе дзейнасць у розных галінах прадстаўленая ў разнастайных дакументах, з якіх можна вылучыць: акт фундацыі, акты касцельных візітацый розных перыядаў, люстрацыя дымоў, метрычныя кнігі, гаспадарчыя справы, розныя справы (карэспандэнцыя, судовыя справы, ахвяраванні).

Арыгінал касцельнага фундушу, які быў выдадзены Я.К. Хадкевічам ад 13 мая 1602 г., захоўваецца ў Бібліятэцы акадэміі навук Літвы ў фондзе № 20 (Судовыя акты) [2]. Тэкст фундушу складзены на латыні. З дакумента можна падкрэсліць наступныя звесткі: інфармацыю аб фундатарах, поўны тытул касцёла, калі і кім ён быў асвечаны, вызначаўся склад кліру і яго абавязак ладзіць набажэнства за касцельных дабрадзеяў. Большую частку фундуша займае інфармацыя адносна матэрыяльнага забяспечвання парафіі. Так, прыводзяцца звесткі пра вёскі і фальваркі, якія перадаваліся на ўтрыманне касцёла, колькасць валок, млыноў, акрэслівалася замацаванне юрыдыкі ў Ляхавічах. Фундушам вызначаліся павіннасці і падаткі на карысць каталіцкай парафіі для розных сацыяльных груп: жыхароў Ляхавічаў, юрыдакчан, сялян Ляхавіцкага графства, сялян падуладных касцёлу вёсак. На арыгінале фундуша прысутнічае пячатка гетмана Хадкевіча.

Апроч арыгінала фундуша, захаваўся шэраг яго спісаў, якія змястоўна не адрозніваюцца ад арыгіналу. Так, у той жа акадэмічнай бібліятэцы захоўваецца копія фундушу, напісаная праз год пасля яго выдачы ў маі 1603 г. Дакумент складзены цалкам на старабеларускай мове Фёдарам Еўлашоўскім [6]. Польскамоўная копія фундушу, перапісаная ў кан. XVIII ст., знаходзіцца ў фондах бібліятэкі Віленскага універсітэта [10]. Падобная ж копія маецца ў Актавай кнізе Случарэцкага суда за 1793–1794 гг., якая захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі [17].

Вялікім і важным пластам крыніц выключнай інфарматыўнасці па гісторыі Ляхавіцкай парафіі з’яўляюцца акты касцельных візітацый. Візітацыі былі пашыранай формай пастырскай апекі і



Репозиторий ВГУ

царкоўна-адміністрацыйнага кантролю за дзейнасцю парафіяльнага святарства. Ладзіліся яны біскупамі або іх архідыяканамі з пэўнай перыядычнасцю, ахопліваючы духавенства, вернікаў, касцёлы з іх фундушамі і маёнткамі, касцельныя карпарацыі, таварыствы, шпіталі, манаскія абшчыны. Падчас правядзення візітацыі для апісання парафій складалася візітацыйная дакументацыя па вызначанаму фармуляру. У ім змяшчаліся пытанні, якія павінны былі задавацца візітатарамі.

На сённяшні дзень вядомыя пяць актаў візітацыі Ляхавіцкага касцёла: 1633 г. [12], 1653 г. [14], 1668 г. [13], (захоўваюцца ў Аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта), 1745 г. [20] (яго копія маецца ў Бібліятэцы акадэміі навук Літвы [7]) і 1782 г. [21] (захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску).

З дадзенага корпусу крыніц можна падкрэсліць досыць важныя звесткі, а менавіта: апісанне касцельных алтароў, інвентар літургічнага начынення (як правіла, мастацкія вырабы з каштоўных металаў), склад духавенства і ахоп парафіі. Значную частку візітаў займаюць звесткі адносна маёмасці парафіі, прыводзяцца інвентары фальваркаў, гаспадаркі, апісваюцца падуладныя вёскі. Нясе ў сабе візіт і інфармацыю адносна павіннасцей і падаткаў на карысць парафіі.

Фармуляр візіта цягам амаль двух стагоддзяў істотна змяніўся і ўдасканаліўся. Разгледзеўшы існуючыя акты візітацыі Ляхавіцкага касцёла, і параўнаўшы іх змест, структуру, можна падкрэсліць наступнае. Акты візітацый 1633, 1653 і 1668 гг. напісаныя пераважна на лаціне. Моўныя змены пачынаюць праяўляцца ўжо з сяр. XVIII ст. Так, візіт 1745 г., утрымлівае ў сябе лацінскія падзагалоўкі і пэўныя раздзелы, якія, аднак, у адрозненні ад папярэдніх актаў, дубліруюцца на польскую мову. Трэба адзначыць, што лацінскія часткі візіта ўтрымліваюць больш дэтальнай інфармацыі адносна прадмета апісання і з'яўляюцца больш інфарматыўнымі за польскамоўныя. Але ў самім дакуменце польская мова дамінуе (ў частцы, дзе апісваецца маёмасць касцёла, лаціна адсутнічае ўвогуле). Візіт жа 1782 г. складзены цалкам на польскай мове, толькі некаторыя рэчы з літургічнага начынення і срэбнага абрамлення абразоў пазначаюцца на лаціне. За амаль два стагоддзі звесткі ў фармуляры сталі больш дасканалымі: з'яўляецца мера вагі ў апісанні срэбных прадметаў, удзяляецца ўвага дэмаграфічным і маёмасным звесткам што датычацца сялян, з'яўляецца сацыяльная характарыстыка парафіі.

Значнай крыніцай па гісторыі касцёла з'яўляецца «Люстрацыя дымоў духоўных і свецкіх у Наваградскім ваяводстве» за 1789 г. [15] (захоўваецца ў Аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта), дзе змяшчаюцца статыстычныя дадзеныя, што апісваюць склад насельніцтва Ляхавіцкага парафіі. Структура дакумента наступная: галоўнай адзінкай, па якой адбываецца падлік з'яўляецца каталіцкая парафія, якая ў сваю чаргу дзеліцца на гарады, вёскі і асобныя маёнткі. У табліцы прадстаўлены звесткі адносна колькасці дымоў (падзяляюцца на розныя катэгорыі) і насельніцтва. У дакуменце згадваюцца асобныя фальваркі і двары, пазначаецца іх уладар. Дадзены дакумент адметны сваімі пашыранымі дэмаграфічнымі звесткамі: пазначаецца агульная колькасць жыхароў кожнага населенага пункта, а таксама адбываецца дыферэнцыяцыя жыхароў па полу і пяці ўзроставым групам (1–16, 16–30, 30–45, 45–60, больш за 60). Таксама прыводзяцца звесткі аб колькасць дымоў, што належаць касцёлу.

Досыць цікавыя звесткі змяшчаюць у сабе метрычныя кнігі Ляхавіцкага касцёла. На сённяшні дзень выяўлена дзве метрычныя парафіяльныя кнігі – рэгістрацыі шлюбаў [19] і хростаў [18]. Захоўваюцца яны ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Самі кнігі, састаўленыя ў 1798 г., ахопліваюць перыяд з 1701 па 1797 г. Аднак засярodзім увагу на тым, што і ў кнізе шлюбаў і кнізе хростаў прадстаўляецца інфармацыя не за ўсе гады, па некаторых звесткі адсутнічаюць. Так, у кнізе шлюбаў няма звестак за 1705, 1730–1737, 1755–1759, 1785 гг. Хросты не пазначаныя за 1757 і 1758 гг. Галоўная інфармацыя, якая змяшчаецца ў кнігах метрыкі – колькасць шлюбаў і ахрышчаных дзяцей у парафіі. Асаблівасцю метрычных касцельных кніг з'яўляецца абазначэнне сацыяльнага статусу парафіян. Пераважная большасць запісаў метрычных кніг Ляхавіцкага касцёлу датычыцца сялян. Аднак сустракаюцца сакраманты, у якіх бярэ ўдзел навакольная, і не толькі, шляхта, што адлюстроўвалася ў запісах. У кнігах Ляхавіцкага касцёла змяшчаюцца звесткі, якія датычацца прадстаўнікоў розных шляхецкіх родаў, а таксама прадстаўнікоў магнатэрыі – Сапегаў і Масальскіх. Таксама на старонках касцельнай метрыкі змяшчаюцца запісы, якія датычыцца сям'і Рэйтанаў (іх родавы маёнтак знаходзіўся ў Грушаўцы, якая ўваходзіла ў склад Ляхавіцкай парафіі), а ў прыватнасці – нацыянальнага героя Беларусі Тадэвуша Рэйтана. Апроч дадзеных сацыяльна-дэмаграфічнага характару, грунтуючыся на дадзеных з метрычных кніг, можна вызначыць паіменны склад касцельнага кліру ў перыяд XVIII ст.



Репозиторий ВГУ

Важным бокам дзейнасці каталіцкай парафіі з’яўлялася дзейнасць фінансава-гаспадарчая. Частка звестак, якія яе датычацца, прадстаўленая ў актах візітацыі, аднак пэўныя аспекты знайшлі адлюстраванне ў разнастайных падатковых дакументах. Так, на сёння выяўлена два дакумента, дзе змяшчаюцца звесткі па выплаце Ляхавіцкай парафіяй падымнага падатку: за 1653 (знаходзіцца ў Бібліятэцы акадэміі навук Літвы) [3] і 1690 (захоўваецца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве) [1]. З падатковых дакументаў можна падкрэсліць колькасць дымоў, якая належала Ляхавіцкаму касцёлу ў розныя часы. Таксама маецца падатковы дакумент, які датычыцца духавенства [4]. Датуецца ён 1662 г. З яго вынікае склад касцельнага кліру па стане на акрэслены перыяд.

Асобна засяродзім увагу на адным важным гаспадарчым дакуменце: раскладзе дзесяціны з Ляхавіцкага графства на карысць парафіі. Вызначаныя сумы з’яўляліся значнай крыніцай даходаў касцёлаў. Сама дзесяціна была вызначана актам фундацыі 1602 г. [17], аднак вядомы на сёння падрабязны яе расклад датуецца толькі пач. XVIII ст. Так, першапачаткова дзесяціна акрэсліваецца лістом уладара Ляхавіцкага графства Ежы Феліцыянам Сапегам у 1718 г. (дакумент захоўваецца ў Бібліятэцы акадэміі навук Літвы) [5], а затым у 1721 г. зацвярджаецца на паседжанні Галоўнага Трыбунала (акт захоўваюцца ў Аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта) [11]. У дакуменце пералічваюцца двары Ляхавіцкага графства і сумы грошаў і копы жыта, якія мусяць паступаць на карысць касцёла. Дубліруецца дадзены акт у Актавай кнізе Случарэцкага суда за 1793–1794 гг., якая захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі [17]. Акрэслім таксама розныя дакументы і справы, дзе сустракаюцца звесткі адносна Ляхавіцкай парафіі.

Па-першае, звесткі, якія датычацца касцёла, сустракаюцца ў судовых актах: Духоўнага Трыбуналу (справа аб нявыплаце Ляхавіцкім кагалам належных сум на карысць касцёла; 1786 г.) [9]; Віленскага гарадскога суда (справа аб наездзе ў Ляхавічах; 1714 г.) [16]; Наваградскага каптуровага суда (справа аб рабаванні збожжа з касцельных гумнаў; 1696–1697 гг.) [10].

Па-другое, справы, якія датычацца пазык касцёлу і самім касцёлам; тастаменты, дзе перадаецца маёмасць Ляхавіцкай парафіі; усялякія ахвяраванні [10].

Цікавай крыніцай па гісторыі Ляхавіцкай парафіі з’яўляецца карэспандэнцыя, якая датычыцца Віленскага біскупа І. Масальскага і пробашча Георгія Палубінскага [8]. Гэта перапіска паміж саноўнікам і пробашчам, а таксама лісты з Рыму наконт справы аб павышэнні Палубінскага да сану архідыякана. Некаторыя лісты ад імя Святога Прастолу дасылаліся наўпрост у Ляхавічы. Урэшце, справа была вырашана станоўча і Георгі Палубінскі быў узведзены ў архідыяканы, а таксама атрымаў пэўную грашовую падтрымку.

Такім чынам, разгледзеўшы выяўленыя на сённяшні дзень крыніцы па гісторыі Ляхавіцкай парафіі Святога Крыжа за перыяд XVII–XVIII ст., можна адзначыць, што комплекс дакументаў яскрава адлюстроўвае разнастайныя бакі жыцця і дзейнасці парафіі ў акрэслены час. Дзякуючы дакументам рознай скіраванасці можна атрымаць найбольш поўнае і досыць грунтоўнае бачанне гаспадарчай дзейнасці парафіі, яе сацыяльнага складу, касцельнага начынення, кліру, а таксама ўзаемаадносін з рознымі асобамі і групамі.


1. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Z. 354. Dział VI. File 3. S. 37–78.
2. Lietuvos mokslų akademijos biblioteka (LMAB). – F20. Nr. 221.
3. LMAB. – F. 43. Nr. 609.
4. LMAB. – F. 43. Nr. 634. P. 13.
5. LMAB. – F. 20. Nr. 1793.
6. LMAB. – F. 43. Nr. 11112.
7. LMAB. – F. 43. Nr. 11113.
8. LMAB. – F. 43. Nr. 11114–11118.
9. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 9. V. 1. Nr. 2401.
10. Vilniaus universiteto biblioteka (VUB). – F. 57. V. Б53. Спр. 1338. P. 3–5.
11. VUB. – F. 5. V. F123. NR. 31380/1.
12. VUB. – F. 57. V. Б53. Nr. 40. P. 41–45.
13. VUB. – F. 57. V. Б53. Nr. 41. P. 105–111.
14. VUB. – F. 57. V. Б53. Nr. 42. P. 98–105.
15. VUB. – F. 57. V. Б54. Nr. 51.
16. Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне. Т. 8: Акты Виленского гродского суда, [1577–1797 гг. / предисловие И. Спрогиса], 1875. – 652 с.
17. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1738. Воп. 1. Спр. 1. Л. 195 – 200.
18. НГАБ. – Ф. 937. Воп. 4. Спр. 207.
19. НГАБ. – Ф. 937. Воп. 4. Спр. 208.
20. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 213.
21. НГАБ. – Ф.1781. Воп. 27. Спр. 223.


Репозиторий ВГУ